Дзяржаўная ўстанова адукацыі

«Дварэцкая сярэдняя школа»

# Забаўляльная гульнявая праграма

# «У госці да Васілінкі»

Падрыхтавала

Настаўніца пачатковых класаў

Гайдук С.Б.

2019 год

Дата правядзення: 26 лістапада 2019 г.

Клас: II

Класны кіраўнік: Гайдук Святлана Бярнатаўна

Месца правядзення: кабінет II класа

Час правядзення: 12.20 – 13.05 гадзін

Тэма: «Беларуская мова — сродак зносін»

Форма: забаўляльная гульнявая праграма

Мэта: далучаць дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры праз беларускія народныя гульні; замацоўваць уменне выкарыстоўваць набыты рухавы вопыт у нестандартных гульнёвых абставінах, пры выкарыстанні розных рухавых заданняў; садзейнічаць развіццю спрытнасці, хуткасці, увагі і памяці; выхоўваць нацыянальную самасвядомасць дзяцей сродкамі рухомай дзейнасці.

Абсталяванне: касцюмы Васілінкі, Воўка, Бабы-Ягі, мятла, тры хвасты лісак, капялюш для паляўнічага, шышкі і спартыўныя касцюмы па колькасці дзяцей, елкі, два кошыка.

## План правядзення

Вядучы: Запрашаю вас на гульні,

Каб павесяліцца.

Тут і спрыт і ваша лоўкасць

Вельмі прыгадзіцца.

Сёння мы з вамі накіруемся у падарожжа па беларускіх гульнях і у гэтым нам дапаможа Васілінка, якая жыве у чароўным лесе.

(Гучыць мелодыя. Усе дзеці павінны выстраіцца цугам: першы бярэцца рукамі ў бакі, астатнія кладуць рукі на плечы іграку, які стаіць спераду яго.

Вядучы і адзін з дзяцей бяруцца за рукі і высока паднімаюць іх: атрымліваюцца «жывыя вароты». Дзеці адзін за адным ідуць да варотаў і з песняй праходзяць праз іх).

Горкай, горкай, горачкай

Ішлі малыя дзеці,

Ваўкоў не баяліся,

Страхаў не пужаліся.

Горкай, горкай, горачкай

Ішлі малыя дзеці,

Ішлі яны лугам,

Ішлі яны кругам.

Гучаць гукі прыроды, да дзецей падыходзіць Васілінка.

Васілінка: Добры дзень, сябры. Прывітанне дзяўчынкі і хлопчыкі. Мяне завуць Васілінка, жыву я ў чароўным лесе.

Васілінка: Лес чароўны мой, вялікі

Адным словам не сказаць.

Мы да елачкі падыйдзем

Каб загадкі адгадаць.

Хто загадкі адгадае,

Той са мной і пагуляе.

Вядучы: А мы вельмі любім адгадваць загадкі.

Васілінка: Ну тады слухайце маю першую загадку

Можа з’есці цэлы полк

Злы, галодны, шэры … (воўк)

Гучыць мелодыя, выходзіць Воўк.

Воук: Добры дзень, я шэры воўк, які жыве у гэтым лесе. Я вельмі люблю гуляць у гульні, а вы?

Вядучы: І мы таксама. Давай пагуляем разам.

***<u>Гульня «Воўк»</u>***

Раз, два, тры, чатыры, (Пляскаюць у далоні)

Зайчык вушкі натапырыў. (Паказваюць вушкі)

Ідзе з лесу воўк, воўк (імітуюць хадзьбу)

Ен зубамі шчоўк, шчоўк. (Далонямі паказваюць клацанне воучай пасткі)

Ты ж ваўчына пачакай! (Пагражаюць пальцам адной рукі)

Як схаваемся, шукай! (прысядаюць, прыкрываюць далонямі твар і не варушацца)

(Воўк ходзіць і назірае. Тых, хто своечасова не закрые твар або заварушыцца, забірае да сябе. (3 разы))

Васілінка: спадабалася цябе гуляць з дзецьмі?

Воўк: Вельмі, малайцы. Аднак пайду я да сваёй хаткі. Да пабачэння.

(Воўк уходзе. Гучыць мелодыя, выбегае Баба-Яга).

Баба-Яга: Прывітанне ўсім вам. А што гэта вы тут робіце, да без мяне?

Васілінка: Гуляем у гульні, знаёмлю дзяцей з жыхарамі нашага лесу.

Баба-Яга: Дык я таксама тут жыву, і гуляць я люблю.

Вядучы: Дык пагуляй разам з намі.

Баба-Яга: Ёсць вельмі цікавая гульня пра мяне: “Баба - Яга”.

Вядучы: А мы яе добра ведаем.

Баба-Яга: Зрабіце круг, пагляджу як вы яе ведаеце.

***Гульня: “Баба-Яга”***

(У цэнтры круга - Баба-Яга, адкуль яна не мае права выхадзіць. У руках у Бабы-Ягі мятла. Дзеці стаяць па кругу і дражняць яе)

Бабка-Ёжка – касцяная ножка,

Печку паліла, курку варыла,

Нос прышчаміла.

(Дзеці адпрыгіваюць ад Бабы-Ягі, а яна дакранаецца да дзяцей мятлой. Калі гэта ёй удаецца, той, выходзе з гульні).

Баба-Яга: Ну, малайцы. А я вось зараз забяру Васілінку і не пушчу вас да яе.

(Васілінка стаіць за Баба-Ягой, якая нікога не пушчае да яе, але ж і сама не адыходзе далёка).

Вядучы: Дзеці, патэбна выратаваць Васілінку. Аднак глядзіце, каб Баба-Яга вас таксама да сябе не забрала.

***<u>Гульня: "Баба-Яга і Васілінка"</u>***

(Дзеці спрабуюць забраць Васілінку, а Баба-Яга павінннна лавіць дзяцей рукой або дакрануцца мятлой. Злоўленыя дзеці выбываюць з гульні. Як толькі Васілінку выратавалі, гульня канчаецца.).

Баба-Яга: Ах вы забралі Васілінку, тады я каго-небудзь з вас забяру.

Вядучы: Дзеці, хутчэй рабіце пары і хавайце адзін аднаго. А ты, Баба-Яга, паспрабуй знайсці каго-небудзь.

***<u>Гульня: "Спрытнякі"</u>***

(Дзеці становяцца ў круг парамі тварам да цэнтра — адзін спераду, другі— ззаду. Пярэдні ігрок расстаўляе рукі у бакі, задні трымаецца за пярэдняга. Баба-Яга знаходзіцца ў цэнтры круга. Яна падбягае то да адной, то да другой пары, стараючыся схапіць задняга іграка, пярэдні ігрок загароджвае яго рукамі і ўвесь час паварочваецца тварам да водзячага).

Васілінка: (падыходзе да Бабы-Ягі). Не разумееш як гуляць з дзецьмі. Ухадзі ка ты, Баба-Яга, ад нас.

(Баба-Яга уходзе).

Васілінка: Давайце працягнем наша падарожжа па чароўнаму лесу. Авось і наступная загадка:

У рыжай разбойніцы

Хвост, як мятла.

Ад кары-уцякла,

Сляды замяла (ліса)

Васілінка: Так, гэта ліса. А вось там, за елкай, мабыць хтосьці хаваецца.

(Падыходзяць да елкі і знаходзяць хвасты ліс).

Вядучы: А мы ведаем вельмі цікавую гульню: “Паляванне на лісаў”. Давай з намі пагуляем, аднак спачатку патрэбна адзначыць паляўнічага і тры лісы.

Я куплю сабе ду-ду,

Я на вуліцу пайду.

Гучней дудачка гудзі,

Мы гуляем – ты вадзі!

***Гульня: “Паляванне на лісаў”***

(Па дамоўленасці дзеці выбіраюць паляўнічага і тры лісы. Астатнія дзеці, узяўшыся за рукі, утвараюць маленькія кругі. Гэтыя кругі раўнамерна размяшчаюцца па пляцоўцы. Кожны круг—гэта лісіная нара, дзе жыве адзін ліс. Сярод кругоў бегае ліс, у якога няма нары. За ім палюе паляўнічы. Як толькі ліс залазіць у якую-небудзь нару, то ліс, што у ей знаходзіцца, павінен адразу ж пакінуць яе і ўцякаць ад паляўнічага ў другую нару. Злоўлены ліс становіцца паляўнічым. У кожнай нары павінен жыць толькі адзін ліс.

Паляунічы не мае права лавіць ліса, які схаваўся ад яго ў крузе).

Васілінка: Да, вельмі цікавая гульня. Мне спадабалася. Да вас жадалі завітаць яшчэ жывёлы. Хаціце даведацца, хто…

З ялінкі на ялінку,

З галінкі на галінку.

Скача агенчык жывы,

Хто гэта? Знаеце вы? (вавёрка)

Васілінка: Правільна, Яны падрыхтавалі для вас пачастункі. Аднак неабходна выканаць вось такое заданне. Зрабіце, калі-ласка, дзве калоны. Перад вамі елкі, да якіх патрэбна паўзці з шышкай на спіне, каб яна не звалілася.

***Гульня: “Не зваліся”***

(Дзеці паўзуць павольна з шышкай на спіне з апорай на калені і далоні да елкі і абратна).

Васілінка: Малайцы, а за гэта вось вам ад ваверак пачастункі.

Вядучы: Вялікі дзякуй вавёркам і табе, Васілінка, за такое цудоўнае падарожжа. Нам пара вяртацца да дому.

Васілінка: Вельмі прыемна было з вамі гуляць. Але ж пара і мне да дому. Да новых сустрэч, сябры. Дапабачэнне.

(Гучыць мелодыя. Усе дзеці павінны выстраіцца цугам: першы бярэцца рукамі ў бакі, астатнія кладуць рукі на плечы іграку, які стаіць спераду яго.

Вядучы і Васілінка бяруцца за рукі і высока паднімаюць іх: атрымліваюцца «жывыя вароты». Дзеці адзін за адным ідуць да варотаў і з песняй праходзяць праз іх):

Горкай, горкай, горачкай
Ішлі малыя дзеці,
Ваўкоў не баяліся,
Страхаў не пужаліся.

Горкай, горкай, горачкай
Ішлі малыя дзеці,
Ішлі яны лугам,
Ішлі яны кругам.

(Дзеці друг за другам выходзяць з залу)